**Паўлава Юлія Сяргееўна**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
**ДУА "Гімназія № 1 г. Барысава"**

**Тэма:** Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля (X клас).

**Мэта**: да заканчэння ўрока вучні сістэматызуюць вывучаны матэрыял па тэме "Дзеяслоў", змогуць паспяхова выканаць тэст выхаднога кантролю.

**Задачы:** ***стварыць умовы для***

- ✓ замацавання ўмення даваць поўную марфалагічную характарыстыку дзеяслова;
- ✓ развіцця ўмення правільнага пісьма і ўжывання дзеясловаў у вусным і пісьмовым маўленні;
- ✓ фарміравання арфаграфічнай пільнасці;

***садзейнічаць***

- ✓ сістэмнаму засваенню тэмы;
- ✓ выхаванню павагі да сямейных традыцый праз дыдактычны матэрыял урока.

**Мэта на мове вучняў (запісваецца на дошцы):**

- ✓ я паўтару асноўныя лексіка-семантычныя групы дзеяслова;
- ✓ я буду ведаць як змяняецца дзеяслоў;
- ✓ я паспяхова выканаю тэст.

**Пералік базавых паняццяў:**

інфінітыў, спражэнне, лады, час, трыванне дзеяслова, зваротнасць, сінтаксічная роля ў сказе.

**Тэхналогія навучання:**

інфармацыйна-камунікацыйная з элементамі праблемнага навучання і тэхналогіі крытычнага мыслення, а таксама з элементамі актыўнай ацэнкі.

**Урок пабудаваны па прынцыпах <u>"перавернутага ўрока".</u>**

**Метады навучання:**

наглядны, славесны, практычны,праблемна-пошукавы.

**Формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці:**

калектыўная, франтальная, індывідуальная, парная.

**Абсталяванне:**

1. Камп'ютар, тэлевізар.
2. Валочка Г.М., Зелянко В.У. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання / Г.М. Валочка., В.У. Зелянко і інш. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 257 с.
3. Ліст з заданнямі для кожнага вучня.
4. Сігнальныя (рэфлексійныя) карткі.
5. Карткі з імёнамі вучняў (вучні для адказу рукі не падымаюць, настаўнік выклікае іх, выцягнуўшы картку з іменем вучня (метад АА).

6. Ацэначны ліст для кожнага вучня (за кожнае заданне налічваецца пэўная колькасць балаў + на ўроку можна атрымаць бонусы за правільныя адказы на пытанні).

**Эпіграф:**

Змагацца, шукаць,
знаходзіць і не здавацца.
А. Тэнісан

## Ход урока

1. **Арганізацыйны момант.**

**Настаўнік:**

– Добры дзень! Старажытныя грэкі казалі: “Добры настрой – палова перамогі”. Калі ў вас зараз добры настрой, падыміце зялёную картку. Бачу, што не ва ўсіх. Спадзяюся, што да канца ўрока ваш настрой палепшыцца. Я вам жадаю сёння на ўроку поспехаў.

2. **Паведамленне тэмы, пастаноўка задач, матывацыя вучэбнай дзейнасці.**

**Настаўнік:**

– У якасці эпіграфа ўзяты словы А. Тэнісана: “Змагацца, шукаць, знаходзіць і не здавацца ”.

– Як вы разумееце іх сэнс? (*Адказы вучняў*).

– Сапраўды, мы сёння з вамі будзем шукаць і знаходзіць веды.

– Словы якой часціны мовы пераважаюць у эпіграфе? (*Дзеяслоў*)

**Каментар настаўніка:**

– Так. Як вы зразумелі з дамашняга задання, тэма нашага сённяшняга ўрока “Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля”.

- Давайце паспрабуем самі сфармуляваць **мэты** сённяшняга ўрока.

(Вучні з дапамогай апорных слоў фармулююць **мэты ўрока на зразумелай ім мове,** настаўнік запісвае іх на дошцы).

**Я паўтару…(** асноўныя лексіка-семантычныя групы дзеяслова)

**Я буду ведаць…** (як змяняецца дзеяслоў)

**Я паспяхова…** (выканаю тэст)

**Каментар настаўніка:**

- Сёння вы сістэматызуеце свае веды па раздзеле “Дзеяслоў”, зможаце прымяніць атрыманыя дома тэарэтычныя веды на практыцы, паспяхова выканаеце тэст.

3. **Праверка дамашняга задання.**

**Настаўнік:**

- Дома вам трэба было зрабіць наступнае:

1. Пазнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам па тэме на сайце http://gimn1.of.by/moodle/ у раздзеле "Беларуская мова 10 клас. Дзеяслоў".



2. Праглядзець прэзентацыю па тэме.
3. Сфармуляваць 3 пытанні, якія ўзніклі па тэме.
4. Намаляваць кластар, схему ці табліцу, дзе адлюстраваць асноўныя катэгорыі дзеяслова.
5. Выканаць трэніровачны тэст "Дзеяслоў".

*Работа па праверцы дамашняга задання:*

**НаШтоБуЗу (на што буду звяртаць увагу; крытэрыі ацэнкі):**

- Прадстаўленне схемы займае не больш за 1 хвіліну.
- У схеме адлюстраваны асноўныя катэгорыі дзеяслова.

➢ **Прадстаўленне кластараў, табліц ці схем,** дзе адлюстраваны асноўныя катэгорыі дзеяслова **(выбарачна некалькі вучняў, бо ў асноўным схемы паўтараюцца).**

➢ **Франтальнае абмеркаванне пытанняў,** якія вучні сфармулявалі падчас вывучэння тэорыі дома.

➢ **Аналіз памылак тэста,** які вучні рабілі на сайце дыстанцыйнага навучання.




**4. Абагульненне па выніках вывучэння вучнямі тэорыі.**

**Настаўнік:**

- Перад вамі табліца, якую мы з вамі пачалі запаўняць, калі паўтаралі назоўнік і прыметнік. Абапіраючыся на ўласныя веды і тэарэтычны матэрыял, з якім вы знаёміліся дома, запоўніце табліцу далей.

| **Часціна мовы** | **Род** | **Лік** | **Склон** | **Час** | **Асоба** | **Тыповая сінтаксічная функцыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Назоўнік** | Адрозніваецца па родах | Змяняецца па ліках | Змяняецца па склонах | | | Дзейнік<br>Дапаўненне<br>Зваротак |
| **Прыметнік** | Змяняецца па родах | Змяняецца па ліках | Змяняецца па склонах | | | Азначэнне |
| **Дзеяслоў** | **?** | **?** | **?** | **?** | **?** | **?** |

**Праверце сябе (самаправерка):**

| **Часціна мовы** | **Род** | **Лік** | **Склон** | **Час** | **Асоба** | **Тыповая сінтаксічная функцыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Дзеяслоў** | Змяняецца па родах у прошлым часе | Змяняецца па ліках | ______ | Змяняецца па часах (прошлы, цяперашні, | Змяняецца па асобах у цяперашнім і будучым | Выказнік |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | будучы) | часе | |

**5. Практычная работа вучняў па прымяненню тэарэтычных ведаў.**

***Настаўнік:***

***– Сядзьце зручна і ўважліва праслухайце верш Яўгена Пясецкага “Мой радавод”:***

*Каб калыскі сваёй (не)забыцца,*
*Каб (не)счэзнуць сярод нягод,*
*Прахалодай спрадвечнай крыніцы*
Наталі *мяне, мой радавод.*

*Маю памяць стагоддзям (не)вынішчыць,*
*Маёй сцежкі (не)звесці ў прыгнёт –*
*Ад маны і ад лёсу рабыніча*
Беражы *мяне, мой радавод.*

*У валошках, якім (не)выцвісці,*
*У вольных спевах вясновых чарод,*
*У Божай міласці, у людской шчырасці*
*Будзе доўжыцца мой радавод.*




***Настаўнік:***

– Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш? Раскажыце пра іх. (*Адказы вучняў*)

– Выпішыце дзеясловы, раскрыўшы дужкі.

–Якому правілу падпарадкоўваецца напісанне гэтых дзеясловаў? (*Правапіс часціцы не з дзеясловамі*)

–Назавіце выключэнні з гэтага правіла. (*Непакоіць, ненавідзець, недамагаць, нездаровіцца, няволіць*).

–Назавіце дзеясловы загаднага ладу (*беражы, наталі*), растлумачце, як яны ўтварыліся.

**Настаўнік:**

- Малайцы. За гэтае правільна выкананае заданне налічыце сабе бонусныя балы.
- А зараз наступнае заданне.

➢ ***Заданне 1***

***Устаўце прапушчаныя знакі прыпынку, падкрэсліце дзеясловы як члены сказа:***

*Ведаць свой радавод ...захоўваць пра яго памяць ... значыць любіць сваю Радзіму.*




**Настаўнік:**

**Праверце сябе (самаправерка):**

*Ведаць свой радавод, захоўваць пра яго памяць – значыць любіць сваю Радзіму.*

**Настаўнік (дзейнічае правіла непадымання рук):**

– Растлумачце пастаноўку коскі ў гэтым сказе. (*Аднародныя члены сказа*).

– Чаму ў гэтым сказе ставіцца працяжнік? (*Дзейнік і выказнік выражаны інфінітывам).*

**– Інфінітыў –** гэта зменная ці нязменная форма дзеяслова? (*Нязменная*)

- Якая яшчэ форма дзеяслова з’яўляецца нязменнай? (*Дзеепрыслоўе*)
- А якім яшчэ членам сказа можа быць інфінітыў? (*Любым членам сказа*)

**Каментар настаўніка:**

- У сказе дзеяслоў звычайна бывае выказнікам, а інфінітыў, звяртаю вашу ўвагу, можа быць любым членам сказа.

➢ ***Заданне 2***

***Вызначыць сінтаксічную ролю інфінітыва:***

| | |
|---|---|
| А. Бачыць плён сваёй працы – сапраўдная радасць для чалавека. | 1.Выказнік |
| Б. Абавязак вучняў – старанна вучыцца. | 2.Азначэнне |
| В. Жаданне маляваць у дзяўчынкі было неадольнае. | 3.Дапаўненне |
| Г. Мы паехалі да бабулі дапамагчы. | 4.Дзейнік |
| Д. Лабановіч загадаў выхаванцам прынесці кнігі, сшыткі. | 5.Акалічнасць |

**Самаправерка па ключы: А4Б1В2Г5Д3**

➢ ***Заданне 3***

**Настаўнік:**

–А зараз я вам прапаную гульню “Замяні адным словам”. Правілы гульні: аб’яднаўшыся **ў пары**, вам трэба кожны выраз замяніць адным дзеясловам.Тры першыя пары атрымаюць дадатковыя балы пры ўмове правільнага выканання задання.

**Гульня “Замяні адным словам”***:*

*1.Пасылаць лісты і атрымліваць іх (перапісвацца).*

*2.Зняць адзенне і надзець іншае (пераапрануцца).*

*3.Кідаць мяч другому і лавіць кінуты ім мяч (перакідвацца).*

*4.Напружана слухаць нешта слаба чутнае (прыслухоўвацца).*

*5.Зрабіць няправільна (памыліцца).*



*6.Весці барацьбу (змагацца).*
*7.Знаходзіцца ў неспакойным стане (хвалявацца).*

**Настаўнік (дзейнічае правіла непадымання рук):**
- Па якой прыкмеце можна аб'яднаць усе гэтыя дзеясловы? **(Зваротныя).**
- Якія дзеясловы называюцца зваротнымі?
- З двума дзеясловамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы. Вызначце асобу, лік і час дзеясловаў.

**Каментар настаўніка:**
- Зваротныя дзеясловы абазначаюць дзеянні, якія накіраваны на самога ўтваральніка дзеяння, яны маюць постфікс -ся, -ца, -цца, што знаходзіцца пасля суфіксаў ці канчаткаў.

***Настаўнік:***

- Хто ў нас сёння адказны за фізкультхвілінку? (Фізкультхвілінку праводзіць вучань.)

➢ **Фізкультхвілінка** (Выключыць тэлевізар).
Каб уважлівымі быць, трэба трошкі адпачыць.
Раз – падняцца, усміхнуцца, два – сагнуцца, разагнуцца.
Тры – галоўку ўверх падняць, на чатыры – паківаць.
Пяць – рукамі памахаць. Шэсць – як я – хутчэй прысесці,
Сем – за парты ціха сесці. Восем – сшыткі падраўняць,
Дзевяць – кніжку ў рукі ўзяць, Дзесяць – будзем працаваць.
Дзеяслоў мы паўтарылі і цікава адпачылі.

➢ ***Заданне 4***

**Гульня чацвёрты лішні:**

| | |
|---|---|
| 1. *Шануюць* | *1. Есці* |
| ***2. Вучаць*** | *2. Бегчы* |
| *3. Кажуць* | ***3. Спаць*** |
| *4. Пяюць* | *4. Даць* |

**Настаўнік:**

- ***У кожнай групе дзеясловаў падкрэсліце лішні.***

Па якой прыкмеце вы гэта зрабілі? ***1.(вучаць – ІІ спр.);*** **2.** ***(спаць – не рознаспрагальны).***

- Якія канчаткі маюць дзеясловы І і ІІ спражэння? (*Адказы вучняў*)
- Чаму дзеясловы другой групы адносяцца да рознаспрагальных? (*Адказы вучняў*)




➢ ***Заданне 5***

***Суаднясіце пачатак і канец прыказкі, дапішыце патрэбныя канчаткі дзеясловаў:***

| | |
|---|---|
| Добра поле ўзар…, | той ніколі не туж… |
| Хто з кнігаю друж…, | тое і пажн… |
| Што пас…, | той пажн… буру |
| Хто пас… вецер, | хлеба больш збяр… |

***Узаемаправерка па ключы:***

Добра поле ўзарэш, хлеба больш збярэш.
Хто з кнігаю дружыць, той ніколі не тужыць.
Што пасееш, тое і пажнеш.
Хто пасее вецер, той пажне буру.




**Настаўнік:**

-Ад чаго залежыць напісанне таго ці іншага канчатка? (*Адказы вучняў*)
-Што такое спражэнне? (*змяненне дзеяслова па асобах і ліках*).

**Каментар настаўніка:**

Правапіс канчаткаў дзеясловаў I спражэння залежыць ад іх асновы і месца націску. Правапіс канчаткаў дзеясловаў II спражэння залежыць ад асновы дзеяслова.

- ***Заданне 6***

***Адзначце рады дзеяслоўных формаў, дзе зроблены памылкі, запішыце памылковыя варыянты правільна:***

1) Пець:пяю, пяешь, пяе, пяём, п'яце, пяюць.
2) Пячы: пяку, пячэш, пячэ, пячом, печаце, пякуць
3) Церці: тру, трэш, трэ, трэм, трацеце, труць;
4) Браць: бяру, бярэш, бярэць, бяром, бяроце, бяруць.

***Узаемаправерка:*** 1,3,4

***Правільныя варыянты:***

1.пяеш,пеяце
3.тром,траце
4.бярэ, бераце

**Настаўнік:**

-Што трэба ведаць, каб не памыліцца ў напісанні канчаткаў дзеясловаў? (*Адказы вучняў*)

- ***Заданне 7***

***Утварыце формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку, пастаўце націск. Растлумачце правапіс канчаткаў.***

*Бегчы, берагчы, прасіць, сцерагчы, піць, вучыць, браць, жыць, весці, біць.*

**Ключ: (Узаемаправерка)**

| | |
|---|---|
| Бегчы-бежыце | Сцерагчы-сцеражаце |
| Берагчы-беражаце | Піць-п'яце |
| Прасіць- просіце | Вучыць-вучыце |

Браць-берац<u>е</u>  Весці-ведзяц**<u>е.</u>**
Жыць-жывяц<u>е</u>  Біць-б'яц**<u>е.</u>**

***Каментар настаўніка:***

Каб не памыліцца ў напісанні канчаткаў дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку, неабходна спачатку паставіць гэты дзеяслоў у 1-й асобе множнага ліку, дзе выразна праяўляюцца націскны і ненаціскны канчаткі: бяж**ым,** п'**ём,** вуч**ым.** Калі канчатак націскны, то націск у 2-й асобе множнага ліку пераходзіць на апошні склад: беражац<u>е</u>, б'яц**<u>е.</u>**

- ***Заданне 8***

**Вучань выразна чытае верш:**

*Калі жывуць яшчэ бацькі,*
*Заўсёды знойдзеш ты прытулак.*
*Яны — твой тыл і паратунак,*
*Калі жывуць яшчэ бацькі...*
*Для іх заўсёды ты дзіця.*
*Яны суцешаць і ўратуюць.*
*І на спакой твайго жыцця*
*Свайго жыцця не пашкадуюць.*
*І там, за далеччу гадоў,*
*Дзе ім не быць з табою разам,*
*Святая іхняя любоў*
*Асвеціць шлях твой цяжкі часам.*

*А. Грачанікаў*

**Настаўнік:**

- Якія пачуцці выклікаў верш? (*Адказы вучняў*).
- Гэты верш прысвечаны бацькам. Галоўнае жаданне для кожнага чалавека ў любым узросце – гэта каб жылі доўга яго бацькі.
- ***Выпішыце з тэксту чатыры дзеясловы (на выбар), вызначце іх спражэнне. Зрабіце марфалагічны разбор дзеяслова "жывуць".***

***Узаемаправерка***

- ***Заданне 9***

***Знайдзіце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні, запішыце <u>выпраўленыя</u> варыянты:***

1. паехаць за сенам;
2. захварэць грыпам;
3. пайсці у грыбы;
4. ажаніцца на Насці;
5. смяяцца з сябра;
6. дзякаваць настаўніка.

**Узаемаправерка па ключы:** паехаць па сена; захварэць на грып; ажаніцца з Насцяй; дзякаваць настаўніку.

- ***Заданне 10***

***Настаўнік:***

***Аб'яднацеся ў пары і запішыце кантэксты полісемантычнага дзеяслова <u>ісці</u>, дзе рэалізуюцца, пры аднолькавым гучанні слова, зусім розныя значэнні. Напрыклад:*** Параход *ідзе* марудна – 'плыве'.

| | |
|---|---|
| Чалавек *ідзе* | |
| Дождж *ідзе* | |
| Гадзіннік *ідзе* | |
| Вясна *ідзе* | |
| Пот *ідзе* | |
| Шахматыст *ідзе* канём | |
| Чутка *ідзе* | |
| Дарога *ідзе* лесам | |
| Бульба *ідзе* ў націну | |

**Самаправерка:**

| | |
|---|---|
| Чалавек *ідзе* | ('рухаецца, ступаючы нагамі'); |
| Дождж *ідзе* | ('капае, падае'); |
| Гадзіннік *ідзе* | ('дзейнічае'); |
| Вясна *ідзе* | ('надыходзіць'); |
| Пот *ідзе* | ('выдзяляецца, цячэ'); |
| Шахматыст *ідзе* канём | ('робіць ход'); |
| Чутка *ідзе* | ('распаўсюджваецца'); |
| Дарога *ідзе* лесам | ('пралягае'); |
| Бульба *ідзе* ў націну | ('расце пэўным чынам'). |

**6. Падвядзенне вынікаў урока:**

***Настаўнік:***

- Напрыканцы нашага ўрока давайце яшчэ раз звернемся да кластара, з якім мы працавалі ў пачатку *(дэманстрацыя слайда)*.

-Як змяняецца дзеяслоў? Якія асноўныя граматычныя катэгорыі ён мае?

- Ці дасягнулі мы задач, пастаўленых на пачатку ўрока, дапаможа нам вызначыць выніковы тэст.




**7. Выхадны кантроль**

**1.** Выкананне тэставага задання

**2.** Самаправерка (*дэманстрацыя слайда*)

### Тэст

| | |
|---|---|
| **1.Дзеяслоў абазначае:**<br>1) прадмет;<br>2) прымету прадмета;<br>3) дзеянне або стан прадмета;<br>4) прымету дзеяння. | **8.Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках мае назву:**<br>1) чаргаванне;<br>2) скланенне;<br>3) спражэнне;<br>4) словаўтварэнне; |
| **2.Пачатковая форма дзеяслова:**<br>1) 1 асоба, адз.лік;<br>2) 3 асоба, мн. лік;<br>3) інфінітыў;<br>4) 2 асоба., мн. лік. | **9.Адзначыць дзеясловы I спражэння:**<br>1) накруціць;<br>2) чытаць;<br>3) жыць;<br>4) бегчы. |
| **3. Незваротную форму нельга ўтварыць ад дзеясловаў:**<br>1) апранацца;<br>2) лячыцца<br>3) усміхацца;<br>4) расхварэцца. | **10. Адзначыць рознаспрагальныя дзеясловы:**<br>1) бегчы;<br>2) даць;<br>3) думаць;<br>4) есці. |
| **4.Адзначыць зваротныя дзеясловы:**<br>1) даць;<br>2) смяяцца;<br>3) думайце;<br>4) купаешся. | **11. Адзначыць памылковае ўжыванне часціцы б(бы):**<br>1) хацела бы;<br>2) занёс бы;<br>3) намаляваў бы;<br>4) прынесла бы. |
| **5.Адзначыць дзеясловы закончанага трывання:**<br>1) здаць;<br>2) думаць;<br>3) піць;<br>4) прачытаць. | **12.Дзейнік і выказнік выражаны інфінітывам у сказах:**<br>1) Век зжыць – не мех сшыць.<br>2) Вучыцца – наша галоўная задача.<br>3) Чытаць гэты твор – асалода і праца.<br>4) Жыць – гэта дзейнічаць на карысць сабе і людзям. |
| **6.Адзначыць дзеясловы, якія пішуцца з *не* асобна:**<br>1) (не)навідзець;<br>2) (не)ведаць;<br>3) (не)знайсці;<br>4) (не)пакоіцца. | **13. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак *-уць (-юць)***<br>1) трапляць;<br>2) з'есці;<br>3) пакарміць;<br>4) заваражыць. |
| **7.Адзначыць дзеясловы складанага будучага часу:**<br>1) напішу;<br>2) буду спяваць;<br>3) прачытаю;<br>4) буду чытаць. | **14.Адзначце зменныя формы дзеясловаў:**<br>1) чытаюць;<br>2) берагчы;<br>3) памыўшыся;<br>4) прыбраны (пакой). |

**Праверце сябе (Самаправерка па ключы):**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | |

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **3** | **3** | **3,4** | **2,4** | **1,4** | **2,3** | **2,4** | **3** | **2,3** | **1,2,4** | **1,4** | **1,4** | **1,2** | **1,4** |

**8. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.**

Вучні падлічваюць колькасць балаў і выстаўляюць адзнаку згодна з прапанаванай шкалой.

Шкала адзнакі

| Балы | Адзнака |
|---|---|
| 75 і больш | 10 |
| 70-75 | 9 |
| 60-70 | 8 |
| 50-60 | 7 |
| 40-50 | 6 |
| 30-40 | 5 |
| 20-30 | 4 |
| 10-20 | 3 |
| 5-10 | 2 |
| 0-5 | 1 |

**9. Дамашняе заданне:**

- У залежнасці ад вынікаў тэста вы атрымаеце рознае дамашняе заданне (дыферэнцыраванае):

**1.** Хто беспамылкова справіўся з тэстам:

Напісаць сачыненне «Традыцыі маёй сям’і».

**НаШтоБуЗУ:**

- Тэкст складаецца з уступу, асноўнай часткі, заключэння.
- Абавязкова ўжывай дзеясловы, якія абазначаюць стан чалавека.

**2.** У каго было некалькі памылак:

**§27, практыкаванне № 196**

**10.Рэфлексія:**

***Настаўнік:***

- Якія вашы ўражанні ад сённяшняга ўрока? Абгрунтуйце.
- Ці спадабалася форма “перавернутага ўрока?”
- А зараз падыміце зялёныя карткі тыя, хто пойдзе з урока з добрым настроем.
- Бачу, што настрой у некаторых палепшыўся. Я гэтаму вельмі рада.

**Заключнае слова настаўніка:**

- Тое, што я хацела вам даць на ўроку, падобна да цудоўнай яблыні, якая таемна шапаціць лісцем у спякоту.

Тое, што я пры гэтым ведаю, усяго толькі галінка ад яблыні.

Тое, што я паспела вам сказаць, усяго толькі яблык ад гэтай галінкі.



Тое, што засталося ў вас, усяго толькі зярняткі.
Але і з гэтых зярнятак вырасце цудоўная яблыня, якая будзе шапацець лісцем у спякоту.
**Дзякуй за ўрок!**

## ЛІСТ ЗАДАННЯЎ

- ✓ **Заданне 1**

***Устаўце прапушчаныя знакі прыпынку, падкрэсліце дзеясловы як члены сказа:***

Ведаць свой радавод захоўваць пра яго памяць значыць любіць сваю Радзіму.

- ✓ **Заданне 2**

***Вызначце сінтаксічную ролю інфінітыва:***

| | |
|---|---|
| А. Бачыць плён сваёй працы – сапраўдная радасць для чалавека. | 1.Выказнік |
| Б. Абавязак вучняў – старанна вучыцца. | 2.Азначэнне |
| В. Жаданне маляваць у дзяўчынкі было неадольнае. | 3.Дапаўненне |
| Г. Мы паехалі да бабулі дапамагчы. | 4.Дзейнік |
| Д. Лабановіч загадаў выхаванцам прынесці кнігі, сшыткі. | 5.Акалічнасць |

**Адказ:** А.....Б.....В.....Г.....Д.....

- ✓ **Заданне 3**

***Замяніце адным словам:***

| | |
|---|---|
| *1.Пасылаць лісты і атрымліваць іх.* | |
| *2.Зняць адзенне і надзець іншае.* | |
| *3.Кідаць мяч другому і лавіць кінуты ім мяч.* | |
| *4.Напружана слухаць нешта слаба чутнае.* | |
| *5.Зрабіць няправільна.* | |
| *6.Весці барацьбу.* | |
| *7.Знаходзіцца ў неспакойным стане.* | |

- ➢ **Заданне 4**

***У кожнай групе дзеясловаў падкрэсліце чацвёрты лішні, абгрунтуйце свой выбар:***

| | |
|---|---|
| 1. *Шануюць* | *1. Есці* |
| *2. Вучаць* | *2. Бегчы* |
| *3. Кажуць* | *3. Спаць* |
| *4. Пяюць* | *4. Даць* |

- ➢ **Заданне 5**

***Суаднясіце пачатак і канец прыказкі, дапішыце патрэбныя канчаткі дзеясловаў***

| | |
|---|---|
| Добра поле ўзар…, | той ніколі не туж… |
| Хто з кнігаю друж…, | тое і пажн… |
| Што пас…, | той пажн… буру |
| Хто пас… вецер, | хлеба больш збяр… |

- **Заданне 6**

***Адзначце рады дзеяслоўных формаў, дзе зроблены памылкі, запішыце памылковыя варыянты правільна:***

5) Пець:пяю, пяешь, пяе, пяём, п’яце, пяюць.
6) Пячы: пяку, пячэш, пячэ, пячом, печаце, пякуць
7) Церці: тру, трэш, трэ, трэм, трацеце, труць;
8) Браць: бяру, бярэш, бярэць, бяром, бяроце, бяруць.

**Правільныя варыянты: ______________________________________________**

**____________________________________________________________________**

- **Заданне 7**

***Утварыце формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку, пастаўце націск. Растлумачце правапіс канчаткаў.***

*Бегчы, берагчы, прасіць, сцерагчы, піць, вучыць, браць, жыць, весці, біць.*

____________________________________________________________________

____________________________________________________________________

- **Заданне 8**

***Выпішыце з тэксту (тэкст на слайдзе) чатыры дзеясловы (на выбар), вызначце іх спражэнне. Зрабіце марфалагічны разбор дзеяслова “жывуць”.***

____________________________________________________________________

____________________________________________________________________

### ➢ Заданне 9

***Знайдзіце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні, запішыце <u>выпраўленыя</u> варыянты:***

7. паехаць за сенам ____________________________________________
8. захварэць грыпам ___________________________________________
9. пайсці у грыбы _____________________________________________
10. ажаніцца на Насці __________________________________________
11. смяяцца з сябра ____________________________________________
12. дзякаваць настаўніка ________________________________________

### ➢ Заданне 10

***Аб'яднацеся ў пары і запішыце кантэксты полісемантычнага дзеяслова <u>ісці</u>, дзе рэалізуюцца, пры аднолькавым гучанні слова, зусім розныя значэнні. Напрыклад:*** Параход *ідзе* марудна – 'плыве'.

| | |
|---|---|
| Чалавек *ідзе* | |
| Дождж *ідзе* | |
| Гадзіннік *ідзе* | |
| Вясна *ідзе* | |
| Пот *ідзе* | |
| Шахматыст *ідзе* канём | |
| Чутка *ідзе* | |
| Дарога *ідзе* лесам | |
| Бульба *ідзе* ў націну | |

# ТЭСТ

| | |
|---|---|
| **1.Дзеяслоў абазначае:**<br>5) прадмет;<br>6) прымету прадмета;<br>7) дзеянне або стан прадмета;<br>8) прымету дзеяння. | **8.Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках мае назву:**<br>5) чаргаванне;<br>6) скланенне;<br>7) спражэнне;<br>8) словаўтварэнне; |
| **2.Пачатковая форма дзеяслова:**<br>5) 1 асоба, адз.лік;<br>6) 3 асоба, мн. лік;<br>7) інфінітыў;<br>8) 2 асоба., мн. лік. | **9.Адзначыць дзеясловы I спражэння:**<br>5) накруціць;<br>6) чытаць;<br>7) жыць;<br>8) бегчы. |
| **3. Незваротную форму нельга ўтварыць ад дзеясловаў:**<br>5) апранацца;<br>6) лячыцца<br>7) усміхацца;<br>8) расхварэцца. | **10. Адзначыць рознаспрагальныя дзеясловы:**<br>5) бегчы;<br>6) даць;<br>7) думаць;<br>8) есці. |
| **4.Адзначыць зваротныя дзеясловы:**<br>5) даць;<br>6) смяяцца;<br>7) думайце;<br>8) купаешся. | **11. Адзначыць памылковае ўжыванне часціцы б(бы):**<br>5) хацела бы;<br>6) занёс бы;<br>7) намаляваў бы;<br>8) прынесла бы. |
| **5.Адзначыць дзеясловы закончанага трывання:**<br>5) здаць;<br>6) думаць;<br>7) піць;<br>8) прачытаць. | **12.Дзейнік і выказнік выражаны інфінітывам у сказах:**<br>5) Век зжыць – не мех сшыць.<br>6) Вучыцца – наша галоўная задача.<br>7) Чытаць гэты твор – асалода і праца.<br>8) Жыць – гэта дзейнічаць на карысць сабе і людзям. |
| **6.Адзначыць дзеясловы, якія пішуцца з *не* асобна:**<br>5) (не)навідзець;<br>6) (не)ведаць;<br>7) (не)знайсці;<br>8) (не)пакоіцца. | **13. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак -*уць (-юць)***<br>5) трапляць;<br>6) з’есці;<br>7) пакарміць;<br>8) заваражыць. |
| **7.Адзначыць дзеясловы складанага будучага часу:**<br>5) напішу;<br>6) буду спяваць;<br>7) прачытаю;<br>8) буду чытаць. | **14.Адзначце зменныя формы дзеясловаў:**<br>5) чытаюць;<br>6) берагчы;<br>7) памыўшыся;<br>8) прыбраны (пакой). |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | |

**Адказы:**

______________________

*Прозвішча, імя*

## АЦЭНАЧНЫ ЛІСТ

| Заданні | Максімальная колькасць балаў | Мой вынік | Бонусы |
|---|---|---|---|
| **Дамашняе заданне:** | | | |
| ➢ **Кластары** | | | |
| ➢ **Сфармуляваныя пытанні** | | | |
| ➢ **Тэст** | **10** | | |
| **Заданне 1** | **4** | | |
| **Заданне 2** | **5** | | |
| **Заданне 3** | **7** | | |
| **Заданне 4** | **2** | | |
| **Заданне 5** | **4** | | |
| **Заданне 6** | **6** | | |
| **Заданне 7** | **10** | | |
| **Заданне 8** | **4** | | |
| **Заданне 9** | **4** | | |
| **Заданне 10** | **10** | | |
| **ТЭСТ** | **14** | | |
| ***Агульная колькасць балаў*** | **80 + бонусы** | | |
| **Усяго балаў і бонусаў:**<br>**Мая адзнака за ўрок:** | | | |